Трансформация образа Блока у Цветаевой происходит в конце цикла. Цветаева больше никогда не назовет его лебедем. Блок у Цветаевой соотносится теперь с ангелом.

В цикле «Стихи к Блоку» четко раскрывается еще одна из основных тем цветаевской лирики – тема любви-разлуки, причем разлука в пространстве цикла «Стихи к Блоку» поэтически сближается с темой смерти.

***М. І. Кірушкіна*** *(УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір.* ***Т. А. Фіцнер,***
*к.ф.н., дацэнт*

## ГІСТАРЫЧНАЯ ПРОЗА В. ІПАТАВАЙ

Гістарычная праўда, вобраз нацыянальнага героя, прататып і вымысел, навізна сюжэта, аб'ектыўная дакладнасць у апісанні мінулага з'яўляюцца магістральнымі ў гістарычнай прозе В. Іпатавай.

Аповесць «Прадыслава» – гэта рамантычны жыццяпіс вядомай князёўны, у цэнтры якога вобраз Ефрасінні Полацкай, зямной жанчыны са сваімі жыццёвымі пакутамі і хваляваннямі, якая прысвяціла сябе служэнню «вышэйшаму, што ёсць на зямлі, – Богу» [1, с. 30]. Адметнае месца ў творчасці пісьменніцы займае і праблема нешчаслівага жаночага лёсу. Пацвярджэнне гэтаму – вобразы Еўкі Касцевіч і яе маладой гаспадыні, Альжбеты Астрожскай, лёс якіх быў не вельмі шчаслівы, «з адчуваннем марнасці жыцця, з ціхай, затоенай надзеяй на нейкія змены» [1, с. 142] (аповесць «Чорная княгіня»). Твор скіраваны на пазнанне прыроды жаночай душы, а раскрыццё яе ўнутранага драматызму дазваляе пісьменніцы перадаць хісткасць жыцця асобнага чалавека на хвалях часу.

В. Іпатава ў аповесці «За морам Хвалынскім» сцвярджае сутнасную блізкасць розных культур, агульначалавечых каштоўнасцей: «У свеце – адна душа, а мы ўсе, усе тыя, хто жыве на зямлі, – толькі яе часткі. Вось чаму людзі павінны слухаць кожны сваю душу – у ёй водгалас адной музыкі» [2, с. 194], – так гаворыць герой твора, палачанін Алекса, якога нечаканае каханне прымусіла накіравацца ў пошуках страчанай дзяўчыны за мора Хвалынскае, у Бухару.

У гістарычных апавяданнях з цыкла «Гул далёкіх стагоддзяў» дзейнічаюць рэальныя гістарычныя асобы, прататыпны жыццёвы лёс якіх лёг у аснову вобразаў мастацкіх твораў. Гэта Паўлюк Багрым, Рагвалод, Усяслаў Чарадзей, пан Юрага. Іх вобразы аўтар узбагачае вымыслам, аўтарскай фантазіяй, асабістым разуменнем гісторыі і характару героя.

Пісьменніца ўвасабляе ў творах тых герояў, якія жывуць ідэяй патрыятызму, змагаюцца за сваю нацыянальнасць, распаўсюджваюць асвету і шукаюць ісціну.

ЛІТАРАТУРА

1 Іпатава, В. Прадыслава [Тэкст] : аповесці і апавяданні / В. Іпатава. – Мн. : Беларусь, 1997. – 272 с.

2 Іпатава, В. За морам Хвалынскім [Тэкст] : аповесці і апавяданні / В. Іпатава. – Мн. : Маст. літ., 1989. – 351 с.

***В. А. Крывапуст*** *(УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір.* ***А. А. Станкевіч,***
*д.ф.н., прафесар*

## МОЎНЫЯ СРОДКІ СТВАРЭННЯ ВОБРАЗА ЖАНЧЫНЫ Ў ПАЭЗІІ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ

Яўгенія Янішчыц – выдатны майстар слова. Адным з асноўных вобразаў яе творчасці з'яўляецца вобраз жанчыны. Паэтэса атаясамлівае яго з вобразам кахання,